Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка»
Исторический факультет

# БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННОСТЬ: ИСТОКИ, СТАНОВЛЕНИЕ, РАЗВИТИЕ (IX–XXI вв.)

Материалы
Республиканской научно-теоретической конференции

Минск, 29 июня 2017 г.

Минск
РИВШ
2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 323(476)(091)(082)
ББК 66.3(4Беи)я43
Б43

Р е к о м е н д о в а н о

советом исторического факультета
УО «Белорусский государственный педагогический
университет имени Максима Танка»
(протокол № 10 от 24 мая 2017 г.)

Р е д а к ц и о н н а я  к о л л е г и я :
кандидат исторических наук доцент *А. В. Касович* (отв. ред.);
кандидат исторических наук доцент *С. П. Шупляк;*
кандидат исторических наук доцент *А. А. Корзюк;*
кандидат исторических наук доцент *А. Ф. Великий*

Р е ц е н з е н т ы :
доктор исторических наук профессор *А. М. Лютый;*
доктор исторических наук профессор *И. В. Варивончик*

Б43 **Белорусская** государственность: истоки, становление, развитие (IX–XXI вв.) : материалы Респ. науч.-теорет. конф., Минск, 29 июня 2017 г. / редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]. – Минск : РИВШ, 2017. – 232 с.
ISBN 978-985-586-041-0.

В сборнике представлены актуальные материалы исследований, посвященные проблемам белорусской государственности в историческом, социально-культурном и геополитическом аспектах.

Адресуется преподавателям, аспирантам и студентам вузов.

**УДК 323(476)(091)(082)**
**ББК 66.3(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-586-041-0**

© Оформление. ГУО «Республиканский институт высшей школы», 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тлумачыцца такімі фактарамі, як недасканаласць памешчыцкіх лясных гаспадарак, а таксама развіццё чыгунак і эвалюцыя лясной прамысловасці, якая выразілася ў стварэнні саюзаў мясцовых лесапрамыслоўцаў акцыянерных таварыстваў і іншых прамысловых прадпрыемстваў, якія спецыялізаваліся на перапрацоўцы драўніны. Да 1913 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі 158 дрэваапрацоўчых, 10 запалкавых і 14 кардонна-папяровых прадпрыемстваў, а прадукты лесаперапрацоўкі набывалі ўсё большае значэнне у лясным гандлі [7, с. 16].

Разам з тым, у цэлым сістэма мясцовага кіравання лясамі на беларускіх землях у вялікай ступені паспрыяла атрыманню значных прыбыткаў казне. У прыватнасці, за кошт лясных даходаў ўтрымліваліся цэнтральныя і мясцовыя ўстановы Ляснога дэпартамента, накіроўваліся плацяжы ў мясцовыя бюджэты, аказвалася дапамога прыватным уласнікам у правільным вядзенні лясной гаспадаркі. Лясныя тавары ўяўлялі сабой адзін з вядучых артыкулаў экспарту, а лясная справа ў эканоміцы дзяржавы лічылася прыярытэтным кірункам, і адносілася да высокарэнтабельных галін матэрыяльнай вытворчасці. Толькі ў прамежак часу з 1888 па 1897 г. даходнасць ад лясоў заходніх і прыбалтыйскіх губерняў склала 41 млн 922 тыс. руб. [10, с. 216].

Такім чынам, усё вышэй адзначанае сведчыць аб важнасці Лесаахоўных камітэтаў ва ўдасканаленні сістэмы кіравання лясной гаспадаркай у беларускіх губернях, якая ў цэлым стала самадастатковай, так як забяспечвала атрыманне ўстойлівага высокага ляснога прыбытку і абапіралася на прызнанне лясоў і лясной гаспадаркі адным з прыярытэтаў дзяржаўнага кіравання.

**Літаратура**

1. Арнольд, Ф. К. История лесоводства в России, Франции и Германии / Ф. К. Арнольд. – СПб. : Издание А. Ф. Маркса, 1895. – 4[illegible], [2] с.

2. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Соврем. шк. : Экоперспектива, 2007–2011. – Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII–пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2005. – 518 с.

3. История лесного дела Беларуси / В. Л. Тарасенко [и др.]; Комитет лесного хозяйства Республики Беларусь, Институт леса Национальной академии наук Беларуси, Брянская государственная инженерно-технологическая академия. – 2-е изд. – Гомель : ИЛ, 2004. – 301 с.

4. НГАБ. Ф. 27. Воп. 2. Спр. 1[illegible]79.

5. НГАБ. Ф. 27. Воп. 2. Спр. 1802.

6. НГАБ. Ф. 139. Воп. 1. Спр. 369.

7. Новицкая, Р. Е. Лесное хозяйство Беларуси. Прошлое и настоящее / Р. Е. Новицкая, Д. Н. Лепешко, Т. Ф. Добыш : Министерство лесного хозяйства Республики Беларусь. – Минск : Редакция журнала "Лесное и охотничье хозяйство", 2013. – 615 с.

8. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Отд. 1. – Т. 8. – № 5120. – С. 148–156.

9. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Отд. 1. – Т. 14. – № 10457. – С. 141–152.

10. Столетие учреждения Лесного департамента. 1798-1898 . – СПб. : Типолитография Ю. Я. Римана, 1898. – [9], 251 с.

## ДВАРАНСКА-ПАМЕШЧЫЦКАЯ КОНЕГАДОЎЛЯ Ў БЕЛАРУСІ (1861-1914 ГГ.)

***Рацько А.Ф., кандыдат гістарычных навук, дацэнт, БДПУ, Мінск***

У другой палове XIX ст. асновай эканомікі Беларусі па-ранейшаму заставалася сельская гаспадарка. Сельскагаспадарчая вытворчасць складалася з двух частак – земляробства і жывёлагадоўлі. Асноўную частку дадатковага прадукту ў рэгіёне давала земляробства. Другім пасля земляробства па ступені даходнасці кампанентам мясцовай сялянскай і памешчыцкай гаспадаркі была жывёлагадоўля, без якой не магло нармальна весціся і само земляробства. Жывёлагадоўля забяспечвала палі ўласнікаў арганічным угнаеннем, прадуктамі харчавання (мяса, малако, тлушч), сыравінай для прамысловасці. Значная частка жывёлы і прадуктаў жывёлагадоўлі паступала на рынак. Важнай прычынай,



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

якая заахвочвала як памешчыкаў, так і сялян разводзіць жывёлу (галоўным чынам коней і валоў), з'яўлялася неабходнасць у іх цяглавай сіле. У сувязі з гэтым пагалоўе коней было адным з асноўных паказчыкаў незалежнасці і самастойнасці ўсякага сельскагаспадарчага вытворцы.

Пасля адмены прыгоннага права сельская гаспадарка Беларусі ўсё больш звязвалася з рынкам. Паступова сельскагаспадарчая вытворчасць набывала прадпрымальніцкі характар. Рост рынкавага попыту на сельскагаспадарчыя тавары выклікаўся развіццём прамысловасці, ростам гарадоў і неземляробчага насельніцтва, маёмасным расслаеннем вёскі. На змену паншчыннай сістэме гаспадарання прыходзяць адпрацовачная і капіталістычная. Калі першая заключалася ў апрацоўцы памешчыцкай зямлі сялянамі сваім інвентаром, то другая, капіталістычная сістэма мела на мэце прымяненне вольнанаёмнай працы сялян-парабкаў, якія апрацоўваюць зямлю памешчыка яго інвентаром. Менавіта ў гэтых гаспадарках шырэй ўкаранялася сельскагаспадарчая тэхніка, ўдасканальвалася структура вытворчасці і больш хуткімі тэмпамі расла яе таварнасць. Гэты тып гаспадарак быў характэрны асабліва для Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губерняў. Цяпер памешчыку патрэбна было ўсё болей набываць уласныя прылады працы і цяглавую жывёлу. Акрамя гэтага, пашырэнне ўнутранага рынку патрабавала развіцця шляхоў зносін, а разам з імі шырокага выкарыстання коннага транспарту, паляпшэння ямской службы і паштовай сувязі. Патрэбны быў конь моцны, непатрабавальны, здольны перавозіць грузы на значныя адлегласці.

У сярэдзіне XIX ст. якасць конскага статку была неадпаведнай. Сялянскія коні выконвалі мноства самых розных работ. Іх кармілі саломай і толькі зрэдку сенам, утрымоўвалі ў дрэнных хлявах, вельмі рана ўключалі ў работу. Таму яны «выглядалі змучанымі, знясіленымі і слабымі» [6, с. 194]. Жывёла ж памешчыцкая адрознівалася ад сялянскай. Дваране-памешчыкі імкнуліся палепшыць як мясцовую пароду коней, так і абзаводзіліся пародзістымі коньмі з іншых краін. Памешчыкі карысталіся паслугамі злучных пунктаў, імкнуліся завезці з краін Усходу і Захаду племянных коней разнастайных парод. Не заўсёды ўвоз коней, асабліва з краін Заходняй Еўропы, быў апраўданы эканамічна і прыводзіў да жаданых вынікаў. Тым не менш у гэтым быў і станоўчы бок, так як пародная разнастайнасць племяннога матэрыялу, якая пры гэтым ўзнікала, аблягчала працу па стварэнні новых спецыялізаваных парод.

Яшчэ у першай палове XIX ст. у заходніх землях Беларусі пачалося фарміраванне новай пароды коней. Галоўнымі «рухавікамі» паляпшэння беларускай пароды коней у той перыяд сталі дзяржаўныя заводскія стайні – Віленская, Лідская і асабліва Ашмянская. Гэтыя канюшні былі ўкамплектаваны жарабцамі як цяжкавозных парод, так і запражных сельскагаспадарчага тыпу. З палепшаных заходнебеларускіх коней пачала фармавацца новая папуляцыя, якая адрознівалася падвышанай працаздольнасцю, але пры гэтым захавала непераборлівасць мясцовай «асновы» і эканамічнасць ў выкарыстанні. Да 40-х гг. XIX стагоддзя гэтых коней, называўшыхся у той час па раёне паходжання ашмянскімі, актыўна выкарыстоўвалі ў племянной працы, прадавалі ў Заходнюю Еўропу [2].

Эканамічны і бытавы пераварот 60-х гг. XIX ст. пахіснуў дваранскае землеўладанне, а разам з тым і конезаводскую справу. Аднак з канца 1870-х гг. сітуацыя мяняецца, назіраецца значны прырост коней у беларускіх губернях. Калі ў 1861 г. у сялян і памешчыкаў Беларусі налічвалася каля 651 тыс. рабочых коней, то ў 1900 г. – 973,8 тыс., што ў 1,5 разы больш [3, с. 188]. З 1900 да 1912 г. пад ўплывам прамысловага крызісу 1900-1903 гг., а затым і дэпрэсіі, калі попыт на сельскагаспадарчую прадукцыю некалькі паменшыўся, у Віленскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях колькасць пагалоўя коней некалькі знізілася.

Клопат пра паляпшэнне сельскагаспадарчых коней дыктаваўся не толькі патрэбамі сельскіх гаспадароў, але і патрэбамі арміі, якая прад'яўляла вялікія патрабаванні да абознага і артылерыйскага каня. Для вызначэння колькасці коней у другой палове XIX ст. у Расійскай імперыі праводзіліся ваенна-конскія перапісы. Дзяржава, якая вядзе войны, для дасягнення поспеху ў баявых дзеяннях павінна была мець дастатковае пагалоўе коней адпаведнай якасці. Дзеля большай дакладнасці ў 1882 г. былі нават выдадзены часовыя



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

правілы аб конскім перапісу, і на падставе іх праведзены перапіс паўсюдна ў Еўрапейскай частцы імперыі. Ваенна-конскія перапісы ўтрымліваюць звесткі па паветах пра агульную колькасць коней у гаспадарках уладальнікаў і колькасць двароў без коняў; аб колькасці коней з размеркаваннем па ўзроставых групах, росце ў розных катэгорый уладальнікаў (у сялян у сельскіх абшчынах, прыватных уласнікаў і жыхароў гарадоў); а таксама аб размеркаванні ўладальнікаў па забяспечанасці коньмі. Высокая дакладнасць ваенна-конскіх перапісаў абумаўлялася тым, што яны праводзіліся для ваенных мэт, пры ўдзеле і пад кантролем вайскоўцаў. Дзякуючы сталасці методыкі збору і апрацоўкі, ваенна-конскія перапісы даволі дакладна адлюстроўваюць дынаміку развіцця конскага пагалоўя.

Абапіраючыся на дадзеныя ваенна-конскіх перапісаў 1888,1893-1894, 1899-1901 і 1912 гг., можна прасачыць дынаміку колькасці коней у 5 заходніх губернях з 1864 па 1912 гг., а таксама дынаміку дваранскага конеўладання. Так, калі ў 1864 г. колькасць коней у 5 заходніх губернях складала 901,0 тыс. галоў, то ў 1912 г. – 1565,0 тыс. галоў. У сваю чаргу дваранскае конеўладанне ў паветах па выніках ваенна-конскіх перапісаў вызначаецца такімі лічбамі: у 1888 г. – 18386 тыс. галоў, а ў 1914 г. – 109239 тыс. галоў [4, с. 56-57].

Як бачым, колькасць коней у дваранскіх гаспадарках павялічылася. Коні як рабочая жывёла у парэформеннай сельскай гаспадарцы з'яўляліся адным з асноўных сродкаў вытворчасці. Дваране-землеўласнікі імкнуліся набыць найбольшую колькасць коней для сельскагаспадарчых работ. У прыватным сектары ім належала прыкладна адна трэць усіх коней. Пры гэтым неабходна мець на ўвазе, што беларускія дваране з 1877 да 1905 г. страцілі значную колькасць зямлі, у той час як асабістая прыватная зямельная ўласнасць іншых саслоўяў за гэтыя гады павялічылася. Такім чынам, колькасць коней у дваран у разліку на зямельную плошчу павялічвалася больш хутка, чым у прадстаўнікоў іншых саслоўяў. Гэта сведчанне таго, што ў памешчыцка-дваранскай гаспадарцы паступова ўкаранялася капіталістычная сістэма, якая выцясняла адпрацоўчую.

Акрамя таго, дваране утрымлівалі коней і ў гарадах, хоць іх колькасць пастаянна памяншалася. Калі ў 1888 г. у 5 заходніх губернях 1168 дваран мела 2176 коней (1,9 на аднаго), то ў 1912 г. 931 уладальнік меў 1846 коней (2,0 на аднаго). Выключэнне складалі толькі гарады Магілёўскай губерні, дзе за гэты час колькасць коней на аднаго двараніна павялічылася да 5,7. У гарадскім прыватным сектары колькасць коней і ўласнікаў павялічылася адпаведна на 23,0% і 25,[illegible]%. Для дваран (у асноўным чыноўнікаў) коні ў горадзе служылі асноўным сродкам перамяшчэння. З усё большым распаўсюджаннем конкі і электрычных трамваяў роля ўласных коней паступова падала, што і адбілася на іх дынаміцы [4, с. 57].

У 1850-х гадах на тэрыторыі Беларусі было 22 невялікіх конных завода і 4 дзяржаўныя завадскія стайні; у 1870-х гадах карысталіся вядомасцю заводы: Горы-Горацкі, Мар'іна Горка, Вішнева, Гарадкі, Любань, Альшэва, Лябёдка, Крэва, Данюшава і іншыя. У іх утрымліваліся [illegible] племянных жарабцоў і больш за 1300 кабыл. Вялікае значэнне ў паляпшэнні конегадоўлі мелі старэйшыя завадскія стайні – Яноўская, Віленская, Бердоўская. У кожнай з іх выкарыстоўвалася ад 45 да 140 жарабцоў верхавых, запражных і цяжкавозных парод [1]. У пачатку 80-х гг. ў Мінскай губерні налічвалася 23 конныя заводы, у Гродзенскай – 14, у Віцебскай – 1 [5, с. 91].

Пачынаючы з 90-х гадоў, усё часцей адзначаецца наяўнасць конных заводаў у дваран-памешчыкаў. Так, у 1890 г. толькі ў Гродзенскай губ. налічвалася 13 конных заводаў. Значны конны завод размяшчаўся ў маёнтку Шчорсы гр. Храптовіча, што дазволіла развесці статак ў 200 коней. У 1912 г. каля Гродзенскай губ. дзейнічала 9 прыватных конных заводаў [4, с. 59]. Людвіг-Станіслаў Аляксандравіч Хамінскі – грамадска-палітычны дзеяч і селекцыянер у 1912 г. ў ваколіцах Альшэва (сённяшняя Мядзельшчына) заснаваў Саюз каняводаў і заняўся на бацькавай канюшні вывядзеннем племяннной пароды коней з неабходнымі якасцямі для сельскай гаспадаркі. Гэтая парода стала вядомая пасля як «Альшэўская запражная». Жарабцы гэтай пароды дэманстравалі максімальную цяглавую сілу, роўную вазе грузу 10-13 тон [1].

Такім чынам, на працягу 1861-1914 гг. дваранска-памешчыцкая конегадоўля Беларусі дасягнула пэўных поспехаў. Амаль што на працягу усяго перыяду назіралася павелічэнне



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

колькасці прыватных конных заводаў. Развіццё капіталістычных адносін і ўдасканаленне сродкаў вытворчасці ў земляробстве і іншых галінах народнай гаспадаркі аказвалі моцны ўплыў на конегадоўлю. Пераход у сельскай гаспадарцы ад ручной працы (асабліва пры пасеве і ўборцы ўраджаю і яго апрацоўцы) да машыннай на коннай цязе не мог не паўплываць станоўча на паляпшэнне конегадоўлі. Сярэднестатыстычная памешчыцкая гаспадарка мела большую колькасць цяглавых адзінак, чым гаспадарка сялянская.

**Літаратура**

1. Белорусская упряжная лошадь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Белорусская_упряжная_лошадь. – Дата доступа: 17.06.2017.

2. Белорусский универсал [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.koni.by/belorusskii-universal. – Дата доступа: 17.06.2017.

3. Гісторыя Беларусі: у 6 т / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000-2005. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII-пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.] – 2005. – 519 с.

4. Жытко, А. П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму 1861-1914 гг.: манаграфія / А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2003. – 233 с.

5. Липинский, Л. П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.) / Л. П. Липинский. – Минск : Наука и техника, 1971. – 256 с.

6. Улащик, Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии / Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1965. – 479 с.

## ГАСПАДАРЧА-ЭКАНАМІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ДВАРАНСТВА БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ АДМЕНЫ ПРЫГОНУ

***Рацько А.Ф., кандыдат гістарычных навук, дацэнт, БДПУ, Мінск***
***Сазонава К.У., 1 курс, гістарычны факультэт, БДПУ, Мінск***

Сітуацыя ў аграрным сектары эканомікі Беларусі ў сярэдзіне XIX ст. мела больш агульных рысаў з тагачаснай сельскай гаспадаркай Польшчы і Прыбалтыкі, чым вялікарускіх губерняў. Асноўным адрозненнем ад агульнарасійскай мадэлі стала захаванне і ўстойлівае развіццё тут буйных і сярэдніх памешчыцкіх гаспадарак. Зямля з'яўлялася асноўным сродкам сельскагаспадарчай вытворчасці. К часу адмены прыгону памешчыцкае землеўладане ў краі было безраздзельна пануючым. К 1861 г. памешчыкам пяці заходніх губерняў належала 16071,1 тыс. дзес. зямлі, або 66,8% зямельнай плошчы. У цэлым па еўрапейскай частцы Расіі ўдзельная вага памешчыцкага землеўладання была значна ніжэй – 24,7% [6, с. 67]. На фоне абшчыннай Вялікаросіі нязвыклай і ненатуральнай уяўлялася практыка падворнай гаспадаркі і ўласнага землеўладання, што прыводзіла да дыферэнцыяцыі сялянства. Таксама большасць сялян Беларусі належала менавіта памешчыкам, а не дзяржаве. Па матэрыялах 10-й рэвізіі 1857 г., колькасць памешчыцкіх сялян у краі складала 52,6%, у той час як у Расіі – 36,3 % [8, с. 114].

Яшчэ адной эканамічнай асаблівасцю беларускіх земель у параўнанні з карэннымі расійскімі губернямі была здача ў арэнду памешчыцкіх і казённых маёнткаў і фальваркаў мясцовай шляхце і дзяржаўным чыноўнікам. Арэндныя дамовы заключаліся часцей за ўсё на тэрмін ад 3 да 12 гадоў. Арэнда стала ў Беларусі адным з самых распаўсюджаных відаў дваранскага прадпрымальніцтва. Пры слаба развітай прамысловасці сродкі, назапашаныя дзякуючы арэндзе, у большасці ішлі на набыццё зямлі [7, с. 209].

К сярэдзіне XIX ст. у сацыяльна-эканамічным жыцці Беларусі адбываюцца важныя змены. У жыццёвы ўклад пачынаюць пранікаць новыя капіталістычныя адносіны, якія пахіснулі асновы старой прыгонніцкай гаспадаркі. Растучы попыт на сельскагаспадарчую прадукцыю ў краінах Заходняй Еўропы і пашырэнне ўнутранага рынку выклікалі паступовы пераход ад замкнёнай натуральнай гаспадаркі да таварна-грашовай. Таварызацыя захапіла галоўным чынам гаспадарку памешчыкаў. Каб павялічыць колькасці сельскагаспадарчай прадукцыі, патрабавалася паляпшэнне агратэхнічнай базы сельскай гаспадаркі на аснове

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ